Наталля ГАЛКО,
загадчык навукова-асветніцкага аддзела
Літаратурнага музея Максіма Багдановіча

# ГРАНІ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## ТВОРЧЫ КОНКУРС "КВІЗАМАНІЯ": ЗАДАННІ, ПАДРЫХТАВАНЫЯ ЛІТАРАТУРНЫМ МУЗЕЕМ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА



Сорак пяць гадоў – гэта многа ці мала? Ці можна правесці ўзроставыя аналогіі паміж чалавекам і музеем? Ці мяняецца музей на працягу існавання і для чаго гэта робіцца? На гэтыя пытанні паспрабавалі адказаць у сваіх відэароліках навучэнцы IX–X класаў мінскіх школ, удзельнікі творчага конкурсу "Квізаманія", прысвечанага юбілею Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, які адзначаўся 1 красавіка.

Мэтамі гэтага праекта было прыцягнуць увагу да асобы М. Багдановіча як мага большай колькасці маладых людзей, а таксама матываваць іх на вывучэнне культурнай спадчыны, спрыяць праяўленню жадання чытаць і размаўляць па-беларуску. Таму заданні былі, вядома, на беларускай мове і тычыліся пытанняў мовы і літаратуры (але не абмяжоўваліся школьнай праграмай – трэба было праявіць кемлівасць, творчыя здольнасці, уменне працаваць у камандзе). Фінальны этап конкурсу "Квізаманія" будзе прысвечаны жыццю і творчасці самога паэта.

Заяўкі на ўдзел у конкурсе падалі 36 школ, і ў пачатку лютага прайшоў паўфінал. Гэта быў адказны момант для ўсіх канкурсантаў, бо вызначалася, хто патрапіць у апошні тур. Спаборніцтва ішло не жартоўнае – кожная каманда праявіла сябе напоўніцу. Наша журы да апошняга не ведала, хто возьме верх. Але лічбы – жорсткія суддзі – прапусцілі ў фінал наступныя каманды: сярэднюю школу № 19, гімназіі № 23, № 25, № 22, № 5 і № 12. Пры падвядзенні вынікаў фіналісты атрымалі асобнікі часопіса "Роднае слова", які будзе карысны ў падрыхтоўцы да апошняга тура "Квізаманіі". Дзякуй усім, хто не пабаяўся праявіць сябе, паказаць свае веды і творчыя здольнасці ў залах Літаратурнага музея Максіма Багдановіча!

**Сімвалам ⤓ пазначаны матэрыялы, даступныя для спампоўвання і азнаямлення, спасылкі па qr-кодзе.**

Напярэдадні фінал конкурсу, а пакуль прапануем скарыстацца матэрыяламі трэцяга тура – магчыма, яны будуць карысныя для правядзення пазакласнай работы (да прыкладу, мерапрыемстваў, прысвечаных Дню роднай мовы).



### ЗАДАННІ

**Заданне 1.** Знайдзіце тлумачэнне пададзеных слоў.

* Паразумецца:
а) стаць разумнейшым;
*б) прыйсці да згоды;*
в) зразумець сутнасць чаго-небудзь.

* Гмах:
*а) вялікая будыніна;*
б) зрабіць некалькі спраў адным махам;
в) махнуць на нешта (некага) рукой.

* Талака:
а) каша з талакна;
б) патоўчаная бульба;
*в) калектыўная праца, узаемадапамога адно аднаму.*

* Маладзік:
а) малады чалавек;
*б) малады месяц;*
в) нешта малое.

* Чаўпці:
а) нешта перамешваць;
б) марудна ісці;
*в) вярзці лухту, казаць недарэчнасці.*

* Агарэць:
*а) здабыць ці набыць з вялікімі цяжкасцямі;*
б) перайсці праз гару;
в) гаравацъ.

* Жарынка:
а) падсмажаная ежа;
*б) гарачы вугельчык;*
в) сонечны промень.

* Налета:
*а) у наступным годзе;*
б) летам;
в) налёт.

**Заданне 2.** Падбярыце антонімы, не ўжываючы *не* (прыклад: антонім да слова *чужы – свой, родны; не чужы* не прымаецца).

Просты, скваппны, шкодны, можна, расставанне, згадзіцца, з'явіцца, змарыцца.

*Даведка:* просты – складаны, скваппны – шчодры, шкодны – карысны, можна – нельга, расставанне – сустрэча, згадзіцца – адмовіцца, з'явіцца – знікнуць, змарыцца – адпачыць.

**Заданне 3.** Аднавіце словы па даступных літарах ⤓.

**Бланк №1**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| А | К | | | | Р | Ы |
| В | Я | | | | К | А |
| С | А | | | | І | К |
| Д | З | | | | Л | Я |
| Ч | А | | | | І | С |
| Ш | П | | | | Р | Ы |
| Т | Э | | | | О | Н |
| К | А | | | | Н | Е |
| Л | Е | | | | Ц | А |
| Т | Ы | | | | Н | Ь |

*Прыкладныя адказы:* бланк № 1 – акуляры, вясёлка, сакавік, дзядуля, часопіс, шпалеры, тэлефон, карэнне, лесвіца, тыдзень; бланк № 2 – хлопчык, відэлец, заданне, парасон, талерка, кватэра, ласунак, размова, адзнака, снежань; бланк № 3 – будынак, сукенка, пытанне, снежань, цеплыня, хвароба, нажніцы, калідор, падзяка, шышшына; бланк № 4 – аўторак, скрынка, чалавек, чэрвень, абдымкі, Радзіма, вяселле, слоўнік, маланка, матылёк; бланк № 5 – цукерка, рамонак, падлога, карысць, чысціня, воблака, капялюш, нядзеля, паштоўка, востраў; бланк № 6 – вавёрка, пачатак, верабей, сакавік, расліна, насенне, аўтобус, зайчаня, чыгунка, камедыя.



**Заданне 4.** Закончыце выслоўі беларускіх пісьменнікаў:

1. Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – … (*мова*). 2. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не … (*ўмёрлі*). 3. Родная мова, быццам цэмент, звязвае … (*людзей*). 4. Добра быць коласам, але шчаслівы той, каму давялося быць … (*васільком*). 5. Шануйце дабрыню, хай і слабую. Шануйце мудрасць, хай сабе нямоглую. Насіце на руках … (*бацькоў*). 6. Чалавек памірае, калі страчвае здольнасць здзіўляцца і захапляцца … (*жыццём*). 7. Рабі нечаканае, рабі, як не бывае, рабі, як не робіць ніхто, – і тады … (*пераможаш*). 8. Вечна тваім застанецца толькі тое, што ты … (*аддаў*).

**Заданне 5.** Адгадайце назвы вершаў ⤓.

**Заданне 6.** Напішыце акраверш да слова *мова* (у любым стылі). На выкананне даецца 5 хвілін.

